Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ



НАША СЛОВА



Газета выходзіць з сакавіка 1990 года **№ 31(416)** **4 ЖНІЎНЯ 1999 г.**

VI з'езд БНФ "Адраджэньне"

Пазьняк – Вячорка: 156 – 152

31 ліпеня і 1 жніўня ў Менску ў Палацы культуры "Сукно" праходзіў VI з'езд Беларускага народнага фронту "Адраджэньне".

На з'езд прыехала 332 дэлегаты практычна з усіх гарадоў і раёнаў Беларусі.

Прысутнічала многа гасцей і журналістаў.

З прывітаннем да з'езда выступілі: Алег Трусаў – старшыня ТБМ імя Францішка Скарыны, Станіслаў Багданкевіч – старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі, Павел Знавец – ад Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (старшыня партыі Мікола Статкевіч знаходзіцца за кратамі), вядомы праваабаронца Валеры Шчукін, якога па яго словах у дзень з'езда "выгналі з турмы" і інш. Было зачытана прывітальнае слова Васіля Быкава.

Адным з першых дакументаў, якія прыняў з'езд была заява ў абарону палітычных вязьняў, якія гібеюць у засценках рэжыму.

З'езд заслухаў справаздачныя даклады старшыні БНФ Зянона Пазьняка, выканаўца абавязкаў старшыні БНФ на Беларусі Лявона Баршчэўскага, а таксама ўсіх намеснікаў.

Слова для справаздачы было дадзена і ўсім кіраўнікам абласных арганізацый.

З першых хвілін працы з'езда адчувалася напружанасць, якая паступова перарастала ў палярызацыю дзвюх плыняў у БНФ: плыні цвёрдых прыхільнікаў Зянона Пазьняка і плыні рэфарматарскага крыла БНФ.

Сутнасць канфлікту вызначыць не зусім проста, але прыблізна гэта выглядае так. Крыло Пазьняка лічыць БНФ адзінай нацыянальнай сілай, якая паслядоўна адстойвае дзяржаўныя і нацыянальныя інтарэсы Беларусі.

Рэфармацыйнае крыло бачыць побач з сабой у адзіным шыхце для барацьбы з рэжымам усе дэмакратычныя і антылукашэнкаўскія сілы незалежна ад іх афарбоўкі і паслядоўнасці іх палітыкі.

Абедзве плыні з'езда даволі грунтоўна былі прадстаўлены сярод выступоўцаў.

Адны дэманстравалі абсалютную веру ў мудрасць і правільнасць палітыкі Зянона Пазьняка, іншыя крытыкавалі гэтую палітыку і шукалі шляхоў яе замены.

На агульным фоне вылучалася заява дэлегацыі Гарадзенскай вобласці, у якой патрабавалася не дапусціць расколу фронта, дабіцца пашырэння сферы яго дзейнасці і таго, каб старшыня БНФ знаходзіўся на тэрыторыі Беларусі.

Дарэчы, небяспека расколу вісела ў паветры з'езда ўсе два дні і раз-пораз штучна падагравалася агучваннем неабачлівых заяў лідараў БНФ, зробленых перад з'ездам.

З'езд ішоў на шумавым і візуальным фоне, які стваралі цвёрдыя прыхільнікі Зянона.

На другі дзень з'езда вострая паленіка разгарнулася вакол парадку выбараў кіраўніцтва.

Аргкамітэт прапаноўваў адначасовыя выбары старшыні, Сойму і Рэвізійнай камісіі. Прыхільнікі Зянона Пазьняка настойвалі на тым, каб спачатку абраць старшыню, а пасля па яго прапанове Сойм. Гарадзенцы патрабавалі спачатку абраць Сойм, а потым з яго складу старшыню.

За два этапы галасавання перамагла пазіцыя Зянона Пазьняка. З'езд прыступіў да выбараў старшыні. На пасаду старшыні БНФ былі вылучаны кандыдатуры Зянона Пазьняка, Вінцука Вячоркі, Юрыя Хадыкі, Віктара Івашкевіча, Вячаслава Сіўчыка, Аляксея Шыдлоўскага.

Хадыка, Сіўчык, Івашкевіч, Шыдлоўскі знялі свае кандыдатуры на карысць Вінцука Вячоркі. У спіс для таемнага галасавання былі ўнесены:

1.Вінцук Вячорка
2.Зянон Пазьняк.

Удзел у галасаванні прынялі 315 дэлегатаў.

Пасля ўскрыцця скрынак у іх аказалася 313 бюлетэняў, з якіх адзін прызнаны несапраўдным.

Галасы размяркаваліся Вячорка: "за" - 152 "супраць" - 160

Пазьняк : "за" - 156 "супраць" - 156

Для перамогі кожнаму кандыдату трэба было набраць не менш як 167 галасоў.

Такім чынам старшыня БНФ абраны не быў. Упершыню Зянон Пазьняк не набраў у БНФ нават 50 адсоткаў галасоў.

Старшыня з'езда Лявон Баршчэўскі абвясціў другую сесію VI з'езда БНФ на верасень-кастрычнік гэтага года. У абодвух бакоў ёсць час падумаць над сваімі палітычнымі пазіцыямі і папрацаваць з дэлегатамі, асабліва з той паўсотняй якая была вылучана, але на з'езд не даехала.

Вынікі з'езда будуць яшчэ аналізавацца, але ўжо можна ўпэўнена сказаць, што голага аўтарытэту, заснаванага хаця б на вялікіх мінулых заслугах, сёння мала. Шараговы Фронт думае над лёсам Беларусі і патрабуе больш эфектыўнага кіраўніцтва.

Раскол не адбыўся, але і праблема не знятая. Фронтам прадаўжае кіраваць Зянон Пазьняк і стары склад Сойму, дзе ў Пазьняка меншасць прыхільнікаў.

З'езд Партыі БНФ не адкрываўся.

Сябра Сойму БНФ,
дэлегат VI з'езда БНФ
Станіслаў Суднік.

Шаноўныя сябры!

Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны мае гонар вітаць удзельнікаў 6 з'езда Беларускага народнага фронту.

У канцы 80-х гадоў БНФ паўстаў супраць цемрашальства струхнелай савецкай сістэмы, аб'яднаў здаровыя сілы канаючай бэсэсэраўскай дзяржавы.

Больш за дзесяць гадоў мінула з таго часу, і БНФ стаў рэальным магутным фронтам барацьбы за адраджэнне роднай мовы, культуры, Бацькаўшчыны, адукацыйным цэнтрам, дзе абруселы беларус адшукваў забытыя веды пра ўласную гісторыю, вучыўся здабываць годнасць і волю, пазбаўляўся местачковай рахманасці і наладжваў зносіны з сусветнай супольнасцю.

БНФ выхаваў шэраг выбітных палітыкаў, голас якіх чутны ў краіне і за яе межамі, аб'яднаў беларускую моладзь, якая карыстаецца роднай мовай, выбірае для краіны нацыянальны шлях развіцця, актыўна пратэстуе супраць умяшальніцтва Расеі ў справы незалежнай Беларусі.

Зараз БНФ, як і ўся краіна, перажывае цяжкія часы. Сёння ў дзяржаве аб'ядналіся прыхільнікі знішчэння Беларусі на мапе свету і вядуць сваю работу па расколванні грамадства. У гэты лёсавызначальны момант, як ніколі, патрэбная магутная сіла, якая спыніла б разбуральныя працэсы, згуртавала б насельніцтва ў беларускі народ і прадоўжыла б адраджэнне краю.

Таварыства беларускай мовы ўпэўненае, што Беларускі народны фронт зможа выканаць найвялікшую задачу.

Жыве Беларускі народны фронт!

Жыве Беларусь!

(Прывітальнае слова VI з'езду БНФ старшыні ТБМ Алега Трусава).

27 ліпеня

9-я ўгодкі прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь-аб'яўленне незалежнасці Рэспублікі Беларусь

27 ліпеня – наша свята!

Цёплым ліпеньскім днём 1990 года Вярхоўны Савет Беларусі па прапанове парламентскай апазіцыі, сярод якой было 13 дэпутатаў вылучаных у беларускі парламент ТБМ, прыняў Дэкларацыю аб незалежнасці Беларусі. Гэты гістарычны акт назаўжды застанецца ў нашых сэрцах, бо ён прывёў да чарговага адраджэння беларускай мовы, гісторыі ікультуры, што было заканадаўча адлюстравана ў Канстытуцыі Беларусі 1994 года.

Зараз, калі кіраўнічыя колы Беларусі зноў загаварылі аб шырокім дыялогу з апазіцыяй, ТБМ прапануе з 1 верасня 1999 года адкрыць Беларускі нацыянальны універсітэт, вярнуць беларускую мову ў нашыя ВНУ, школы і дзіцячыя садкі. Незалежная беларуская дзяржава не можа існаваць без сістэмы нацянальнай адукацыі ўсіх узроўняў.

Сакратарыят і рэдакцыя газеты "Наша слова".

У Берасці

27 ліпеня 1999 года ў гонар Дня Незалежнасці Беларусі была здзейснена акцыя. Над Берасцейскай крэпасцю невядомымі быў узняты бел-чырвона-белы сцяг. Гэта крэпасць была пабудавана расейцамі ў XIX ст. на месцы зруйнаванага імі старажытнага места, як сімвал расейскага панавання на Берасцейшчыне і бадай упершыню над ею рэяў беларускі сцяг.

У Дзень Незалежнасці вядомая Холмская Брама сапраўды сталася беларускай, бо менавіта на ёй рэяў святы сцяг Беларусі. Прыемна ўзрадавала рэакцыя турыстаў: Яны з вялікаю ахвотаю пачалі фатаграфавацца на фоне "ўзятай" крэпасці.

Н.К.

У Віцебску

Калісьці Дзень Незалежнасці 27 ліпеня ўспрымаўся многімі віцебскімі дэмакратамі як нейкае штучнае свята. Агрэсіўны наступ на здабыткі беларускай незалежнасці выклікаў увагу і павагу да гэтай даты. Вось ужо тры гады запар віцебскія прыхільнікі дэмакратыі ладзяць урачыстыя адзначэнні Дня Незалежнасці. Сёлета святкаванне 27 ліпеня апазіцыянеры правялі не на ўлонні прыроды на ўскрайку горада, як было ў папярэднія гады, а ў скверы на плошчы Уладзіміра Леніна.

Па традыцыі такая акцыя арганізоўвалася ўсімі дэмакратычнымі сіламі горада. Аднак само мерапрыемства паказала, што віцебскія апазіцыйныя партыі пакуль не здольныя павесці за сабой масы. На мітынг з нагоды свята прыйшло блізу ста чалавек.

За паўтары гадзіны, якія працягвалася імпрэза, выступіў з дзесятак партыйцаў. Гаварылі прамовы, чыталі вершы, спявалі песні. Тэмаў для выступаў было багата. Расказвалі і пра даўніну, і пра сённяшнія палітычныя падзеі, і пра гаротны стан роднай мовы. Але сэнс усяго выказанага зводзіўся да аднаго: цяперашні рэжым у Беларусі нелегітымны, спробы здаць суверэнітэт незаконныя.

Гэтыя настроі выразіліся ў двух рэзалюцыях. У адной з іх мітынгоўцы звярнуліся з такімі словамі да Аляксандра Лукашэнкі: "Не Вамі, Аляксандр Лукашэнка, здабытая незалежнасць нашай дзяржавы, і не Вам ёю гандляваць. Гандлюйце тым, што вы зарабілі самі сваёй працай, але не чапайце таго, што вам не належыць! Незалежнасць належыць вольным грамадзянам краіны, якую яны лічаць сваёй Радзімай. А Радзіму, як і маці, чэсныя людзі не прадаюць". Удзельнікі мітынгу таксама прынялі зварот да прэзідэнта Барыса Ельцына і шэрагу іншых суб'ектаў расейскай палітыкі. У дакуменце выказаны пратэст супроць заявы Міністэрства замежных спраў Расеі аб легітымнасці ўлады прэзідэнта Лукашэнкі пасля 20 ліпеня. На думку складальнікаў звароту, такая заява Расейскай Фэдэрацыі з'яўляецца ўмяшальніцтвам ва ўнутраныя справы Беларусі .

Напрыканцы акцыі мітынговай грамадзе не адразу ўдалося ўшанаваць памяць знакамітага земляка Уладзіміра Караткевіча, пятнаццаць гадоў з дня смерці якога споўнілася 25 ліпеня. Перапужаныя ахоўнікі парадку не дазволілі дэмакратам падыйсці са сцягамі і харугвамі да зусім блізкага - у 150 метрах — помніка знакамітаму пісьменніку. Апазіцыянерам давялося пакінуць нацыянальную і партыйную атрыбутыку ды рушыць да манумента пад пільным вокам міліцыянта?.

Юрась Сцяпанаў, Рэсурсны цэнтр "Згода" (Віцебск).

Наша віншаванне

Сакратарыят і рэдакцыя газеты "Наша слова" віншуе свайго аўтара і актыўнага сябра ТБМ рабочага Менскага трактарнага завода Аркадзя Галая з 50-гадовым юбілеем і жадае актыўнай працы на карысць беларускага адраджэння. Сп. Аркадзь актыўны ўдзельнік усіх пікетаў і мітынгаў, якія ладзіць ТБМ у Менску, а таксама ініцыятар стварэння суполкі ТБМ на сваім заводзе. Да віншавання далучаюцца сябры ТБМ з раённай арганізацыі ТБМ Ленінскага р-на Менска.

Віншаванне

Суполка № 5 ТБМ Свіслацкай Рады г. Менска віншуе сваіх сяброў Трусава Алега і Галая Аркадзя с днём нараджэння.

Жадаем ім поспехаў у працы на ніве беларускага адраджэння, моцнага здароўя, сямейнага дабрабыту, светлага шляху ў новую Беларусь.

Мы вельмі Вам удзячны за Вашы надзённыя клопаты па захаванню і ўзбагачэнню самай вялікай нацыянальнай каштоўнасці – беларускай мовы.

Жыве Беларусь!



№ 31(416) 4 ЖНІЎНЯ 1999 г. наша СЛОВА

Слоўнікі ў сістэме старажытнага этна-культурнага рэгіёна Беларусі (Мсціслаўшчына)

У XII ст. граніцы, як сцвярджаве расейскі акадэмік Б.А.Рыбакоў, феадальных утварэнняў прайшлі па старых рубяжах племянных саюзаў УІ – УІІІ ст.ст. На тэрыторыі Мсціслаўскага княства, а пазней і ваяводства, як сцвярджаюць археолагі і гісторыкі, жылі радзімічы, якія межавалі з смаленскімі крывічамі. Мсціслаўшчына, як Полаччына, Случчына, Тураўшчына, Магілёўшчына, Гомельска-Чарнігаўскі аазіс, Наваградчына з'яўляецца тым этна-культурным раёнам, які мае сталае старажытнае насельніцтва, сталае засяленне, аднолькавыя гістарычна-сацыяльныя ўмовы.

Пасля заканчэння збірання матэрыялаў для Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы (надрукаваны ў 1963 годзе) было намечана разгарнуць збіранне мясцовай дыялектнай лексікі з арыентацыяй на складанне васьмі рэгіянальных дыялектных слоўнікаў.

1.Слоўнік Полацка-Віцебскіх гаворак.

2. Слоўнік Менска-Маладзечанскіх гаворак.

3.Слоўнік Магілёўшчыны.

4.Слоўнік Гомельшчыны.

5. Слоўнік Слуцка-Бабруйскіх гаворак.

6. Слоўнік Палескіх гаворак.

7.Слоўнік Гарадзеншчыны.

8. Слоўнік Берасцейска-Пінскіх гаворак.

У 1959 годзе Вучоны савет Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа вынес рашэнне выдаць асобным выпускам падрыхтаваныя метадычныя матэрыялы -- распрацоўкі па некаторых тэмах, памятку для збіральнікаў лексічных матэрыялаў (Інструкцыю).

Да 1996 года выйшлі з друку пяць тамоў занальнага "Слоўніка беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча" (1970-1986), "Матэрыялы для слоўніка Менска-Маладзечанскіх гаворак" (1970, 1974, 1977), "Тураўскі слоўнік" у пяці тамах (1982-1987). З'явіліся асобныя слоўнічкі, падборкі слоў з розных раёнаў Беларусі (Гл.агляд слоўнікаў Я. М. Рамановіч "Аб здабытках беларускай дыялектнай лексікаграфіі за апошнія 25 гадоў", які змешчаны ў манаграфіі "Лексічныя ландшафты Беларусі. Жывёльны свет", 1995.С. 15-23).

Выданне слоўнікаў наогул мае вялікае навукова-культурнае значэнне: яны з'яўляюцца "сховішчам" фактаў, якія існуюць толькі ў вуснай форме, і крыніцай для стварэння Агульнага слоўніка народных гаворак Беларусі. Гэта ўжо наступная чарговая нацыянальная задача. У Англії і іншых краінах гэта задача выканана на высокім навуковым узроўні. Гэта ідэя вядома даўно. У Беларусі І. І. Грыгаровіч (XIX ст.) склаў праграму стварэння такога слоўніка. Наогул лічыцца, у каго, у якой нацыі больш розных слоўнікаў, энцыклапедычных даведнікаў, атласаў, тая лічыцца прагрэсіўнай, перадавой, культурнай. Беларускай лексікаграфіі пашанцавала, бо яшчэ ў XIX ст. у нас быў І.І.Насовіч. Гэты вучоны лексікограф па заданні Расейскай імперскай акадэміі склаў слоўнік народнай мовы. У яго слоўніку занатавана толькі больш за 30 тысяч слоў, за што ён атрымаў Дзямідаўскую прэмію (714 рублёў срэбрам) у Аддзяленні расейскай мовы і славеснасці.

Тагачасная гістарычная рэчаіснасць, палітычная сітуацыя, практычна прымусіла Акадэмію Расейскай імперыі звярнуцца да вучоных і даць ім заказ. У сувязі з тым, што пры спрэчцы Расеі з Польшчай, чыя Беларусь, афіцыйная і навуковая Расея не магла чытаць 18 тысяч тамоў канцылярыі Вялікага Княства Літоўскага, дзе дакументы былі напісаны на старабеларускай мове. Палякі таксама тады ж былі ўзяліся за складанне падобных слоўнікаў (у Польшчы ў якасці літаратурнай мовы выкарыстоўвалі лацінскую мову).

І толькі Г.Ф.Юрчанка, адзін з вялікай арміі збіральнікаў народных слоў, занатаваў і надрукаваў за 45 гадоў слоў, назваў навакольнага свету і абстрактна-разумовых паняццяў Мсціслаўшчыны 50 тысяч лексічных адзінак у дзевяці слоўніках.

Г.Ф.Юрчанка, як мясцовы жыхар і дыялектолаг, знаўца найтанчэйшых нюансаў мовы Мсціслаўшчыны, нарэшце пісьменнік даў яе не толькі багатую, абагуленую фанетыку, аб'ектыўную марфалогію, сінтаксіс, але і лексіку з найбагацейшай глыбінёй у сематыцы, са сваім унутраным зместам. Увесь гэты матэрыял вельмі дапаўняе, дэталізуе характарыстыку значэнняў, сінанімічны рад у нашай літаратурнай мове. Яго слоўнікі паказваюць, што на беларускай мове можна выказаць найтанчэйшыя адчуванні, пачуцці, філасофскія ідэі, мастацкасць і г.д. І ўсё гэта праілюстравана ў слоўніках кантэкстамі. У слоўніках кожнае слова нясе адбітак этнаграфічных асаблівасцяў у іпастасях мужчынскіх і жаночых. Перадаецца ў яго слоўніках дух спрадвечны славянскай Мсціслаўшчыны. Значыць, і гістарычны аспект праглядвае праз магутны сучасны пласт народнага духу. Бясспрэчна, усюды прысутнічае геаграфічны аспект усходняга славянства. За аснову ўзяты куст вёсак на чале з роднай вёскай Кудрычы Мсціслаўскага раёна.

Слоўнікі яго паказваюць, што можна ў размове карыстацца, абыходзіцца сваім моўным матэрыялам, не запазычваючы словы. Ёсць у слоўніках і тое, што можна лёгка стварыць. Аўтар не пераходзіў мяжу рэальнасці.

Творчасць Г. Ф. Юрчанкі ацэнена ў станоўчых рэцэнзіях, лік якіх дасягае за 50 адзінак. Навуковая грамадскасць высока ацэньвае цыкл работ "Слоўнікі народнай мовы Мсціслаўшчыны", які быў прадстаўлены Інстытутам мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі на Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь, . Яго творы з'яўляюцца ўкладам у скарбніцу матэрыялаў для вырашэння розных пытанняў народазнаўства і культуры ўсходніх славян, усяго славянства і культуры ўсяго свету. Яго творы – гэта першая праца выключнай нацыянальнай значнасці і заслугоўвае самай высокай дзяржаўнай ацэнкі.

Іван Яшкін, кандыдат філалагічныхнавук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН РБ.

Ушанаванне памяці

нашых слынных людзей праводзіць ТБМ імя Ф.Скарыны Віленскага Краю

За апошні час у Віленскім раёне вуліцы носяць імёны К.Каліноўскага (Меднікі), Ф.Багушэвіча (Рукоіны), У.Сыракомлі (Дукшты), А Міцкевіча (Нямежа і Ваўчуны), Б.Тарашкевіча (Лаварышкі).

Па прапанове ТБМ на бліжайшай сесіі дэпутатаў Віленскага р-на будзе разглядацца пытанне аб увекавечванні памяці ў назовах вуліц у Лаварышках Ф.Скарыны, Адама Станкевіча і Яна Семашкевіча (Янка Быліна). Дарэчы, гэта не выпадкова. Праз Лаварышкі праходзіць Полацкі тракт (шлях) па якому у свой час неаднаразова праязджаў беларускі першадрукар Францішак Скарына. У 1925-27гг. у Лаварышскім касцёле працаваў святаром Ян Семашкевіч (псеўданім Янка Быліна), беларускі паэт, які сустракаўся тут з усім вядомым Браніславам Тарашкевічам. У хуткім часе на будынку Лаварышскай школы, дзе вучыўся Б.Тарашкевіч будзе ўстаноўлена мемарыяльная (памятная) дошка, аб чым ужо прынята сумеснае Рашэнне Савета Віленскага РайАНА і педсавета школы. Праўда, прапанова ТБМ аб наданні школе імя Б.Тарашкевіча адхілена, але будзем спадзявацца, што ў далейшым і школа будзе насіць яго імя.

Сёлета спаўняецца 50 год з дня смерці ў сталінскім Гулагу Адама Станкевіча, беларускага святара, грамадскага і палітычнага дзеяча. 1 жніўня 1999г. у 10.30 у касцёле Святога Барталамея ў Вільні, на Зарэччы адбудзецца святая імша за ўпакой душы Адама Станкевіча і Яна Семашкевіча, багаслужэньне на беларускай мове будзе праводзіць ксёндз а.Ян Шуткевіч. Таксама плануецца ў гэты дзень правесці набажэнства і ў касцёле ў Лаварышках, а таксама правесці Тарашкевічавы чытанні.

Усё гэта праводзіцца пад дэвізам "Каб помнілі і шанавалі Бога, сям'ю, мову, Бацькаўшчыну..." сіламі ТБМ імя Ф.Скарыны Віленскага Краю. Гэта працяг нашага мерапрыемства, якое праходзіла 22-23 траўня ў Валунаве Докшыцкага р-на Віцебскай вобласці на базе гіст-этн.музея "Зосцянковая хатка" прысвечаная Году Бога-Айца і Міжнароднаму году пажылых людзей.

Юры Гіль.
Старшыня ТБМ Віленскага Краю, дэпутат Віленскага раёна.

Павел Сцяцко,
доктар філалагічныхнавук, прафесар, намеснік старшыні Гарадзенскай абласной рады ТБМ імя Францішка Скарыны

"З чужой моўнай практыкі..."

Працяг

Лаціна і лацінскі — а не латынь і латынскі. У "Тлумачальным слоўніку беларускай мовы" (Т. 3. Мн.,1979.С.25) чытаем: "Латынь, -і,ж.Лацінская мова". А на 27 старонцы: "Лаціна, ж. Тое. Што і лацінка. Лацінка, ж. Лацінскі алфавіт, лацінскае пісьмо". Але як тут дастасаваць гэтую ***латынь*** – з цвёрдым гукам (т) – да словаў ***лацінка, лацініца, лацінскі*** (з мяккім гукам (ц)? Калі нарматыўным лічыць ***латынь***, тады ўжо мусіць быць і ***латынька, і латыніца, латынскі***. Дарэчы, такую паслядоўнасць захоўвае "Русско-белорусский словарь" 1953 года (с.230). Але ж у "Тлумачальным слоўніку", як мы бачылі, няма гэтых штучных формаў ***латынка, латыніца*** і ***латынскі***. І жыхары Лацыюма – правінцыі, якая дала назву мове, правільна называюцца ***лаціняне***, бо ў корані слова, якое называе правінцыю, няма гука ***т***, а толькі ***ц***. Дык чаму ж мова гэтых лаціянаў мусіць называцца латынь, а не лаціна?

Слова ***латынь*** сучасныя расейскія слоўнікі падаюць толькі як гутарковае слова. Яго не змяшчаюць на сваіх старонках нават спецыяльныя даведнікі. Напрыклад, О.С.Ахманава "Словарь лингвистических терминов" (М., 1966), "Лингвистический энциклопедический словарь" (М., 1990). Няма яго і ў галіновых перакладных і тлумачальных слоўніках. І ў "Слоўніку іншамоўных слоў" А.М.Булыкі (Мн., 1993). "Русско-белорусский словарь лингвистических терминов" (Мн.,1988.С.45) падае толькі: ***латинизм – лацінізм, латиница – лацінка***. У "Слоўніку лінгвістычных тэрмінаў" (Мн., 1990. С.74) бачым толькі "Лацінка і лацінізмы – словы або выразы з лацінскай мовы". І ў самым аўтарытэтным беларускім лінгвістычным даведніку "Беларуская мова: Энцыклапедыя" (Мн., 1994) падаюцца толькі рэестравыя словы "лацінка" і "лацінская мова".

Лацінская мова, як сцвярджаецца тут (с.290), — гэта мова племені лацінаў (якія насялялі вобласці Лацый у.заходняй частцы сярэдняй Італіі з цэнтрам у Рыме).

Як бачым, натуральным найменнем мовы племені лацінаў і ёсць лаціна (а не латынь). Гэта засведчыў і "Беларуска-расійскі слоўнік" М.Байкова і С. Некрашэвіча (Менск,1926.С.157), дзе бачым: "Лаціна ж. – латынь, лаціна і лацінка ж. – латинская азбука. І ў даведніку 1997 года падаецца: "Латынь – лаціна" (Руска-беларускі слоўнічак па кнігазнаўстве. Мн.,1997. Нацыянальная бібліятэка Беларусі).

А вось новы "Тлумачальны слоўнік" (Мн.,1996) беспадстаўна паўтарае недарэчнасці свайго папярэдніка, не лічачыся з больш познімі даведнікамі. Так, на С.314 чытаем:"Латынь,-і, ж. Лацінская мова". Або: "Латыніст, м. Спецыяліст па лацінскай мове"; "Латынізмы. Словы ці моўны зварот, якія запазычаны з лацінскай мовы". Ці яшчэ вось якая чарговая недарэчнасць: "Латынізаваць... змяніць (—няць) які-небудзь алфавіт лацінскім". Але ж лацінскі алфавіт, чытаем у Слоўніку, — гэта лацінка, а не латынь (ад якога – латынізаваць). Вось у якія цянёты загналі самі сябе аўтары "Тлумачальнага слоўніка" 1996 года!

Натуральнымі ёсць тэрміны: "Лаціна (гутарковая назва лацінскай мовы), лацінка (лацінскі алфавіт), лацінізм (лацінскае слова), а таксама лацініст, лацінізаваць, лацінізаваны".

Даследнік, даследчык, вопытнік. Слоўнікі 20-х гадоў з значэннем рас. ***исследователь*** фіксавалі ўтварэнне з суфіксам ***–нік***: ***даследнік*** (БРС-26.С.90). Як і іншыя назоўнікі на ***–нік***: ***даручнік – поручитель, дастаўнік – поставщик, даведнік – посетитель, дольнік – пайщик, закупнік – закупщик, заступнік – заместитель, застаўнік –залогадатель, заяўнік – заявитель, лётнік – лётчик.***

У слоўніках, выдадзеных пасля 1933 года, сталі замяняцца такія словы на адпаведнікі з суфіксамі, уласцівымі рускай мове. Так, на месцы словаў на ***–нік*** запанавалі іх адпаведнікі на ***–шчык (-чык)***. "Русско-белорусский словарь" 1953 года ўжо не падае слова ***даследнік*** як адэквата ***исследователь***, а толькі ***даследчык***. На с.186 чытаем: "Исследователь – даследчык". Гэты артыкул прадубляваны і ў яго наступных перавыданнях (РБС-82, РБС-93, РБС-98). А слова ***даследнік*** мае ў слоўніках больш вузкае значэнне "той, хто праводзіць дослед". Яно падаецца як дублет да ***вопытнік*** – адэкват рас. ***опытник.***

Так , РБС-82 (Т. 1. С. 607) фіксуе: "Опытник – даследнік, вопытнік". Прадубляваны гэты артыкул і ў перавыданнях 1993 і 1998 г.г. Аднак штучнасць гэтага ***"вопытніка"*** відаць і з таго, што яго не зафіксаваў нават шасцікнігавы "Тлумачальны слоўнік", у якім шмат небеларускіх словаў. Не падае яго і "Тлумачальны слоўнік" 1996 года. Тут бачым: "Даследнік, м. Той, хто праводзіць дослед. Гэта быў заўзяты і мудры даследнік" (с.171) і "Даследчык, м. Той, хто займаецца навуковымі даследаваннямі". (Тамсама). Але ж даследванні без доследаў ці мажлівыя? Слова ***дослед*** – нульсуфіксавае ўтварэнне ад ***даследаваць***. Дый значэнне слова ***дослед*** сведчыць пра гэта. У самім ТС –96 засведчана: "Дослед, м. Навуковы эксперымент, прысвечаны вывучэнню пэўных з'яў, атрыманню неабходных даных для высвятлення заканамернасцей" (с.182). Таму невыпадкова сучасны нацыянальны друк карыстаецца словам ***даследнік*** і з значэннем ***даследчык***. Вось некаторыя прыклады. "Пра тагачаснае беларускамоўнае насельніцтва мы даведаемся з апісанняў сучаснікаў, ад нешматлікіх даследнікаў". (Беларускі гістарычны агляд. Том 4. Мн., 1997.С.36). "Беларускі даследнік Павел Церашковіч прааналізаваў больш за 200 беларускіх ідыёмаў". (Тамсама.С.43). "Вядомы расейскі даследнік царкоўнага права Н.Свораў" (Галіна Дзербіна. Права і сям'я ў Беларусі эпохі Рэнесансу. – Мн.,1997.С.100).

Як бачым, слова ***даследнік*** выразна акрэслівае асобу, якая займаецца доследамі, якая даследуе-высвятляе пэўныя заканамернасці. Так што выкарыстанне назоўніка з суфіксам ***–нік*** на месцы яго дублета з ***–чык*** апраўданае: утварэнні з суфіксам ***–нік*** больш уласцівыя беларускай мове. Гэта, дарэчы, пацвярджае і факт замены слова ***ўзрыўшчык*** на ***ўзрыўнік***, пра што ўжо ішла гаворка.

Гэтая тэндэнцыя на замену суфіксаў ***–цель, -чык(-шчык)*** на ***–льнік, -нік,-ец-ца*** досыць выразна выяўляецца ў сучасным нацыянальным друку, пра што няраз ужо згадвалася.

Нагадаем яшчэ выкарыстанне ***бунтаўнік*** замест ***бунтаўшчык*** і ***перакладнік*** замест ***перакладчык***: "Заўвага перакладніка" (Анры Дэні. Гісторыя эканамічнай думкі. Дапаможнік для студэнтаў. Мн.,1996.С.66). "Як рэагаваць на дзеянні бунтаўнікоў?" (Т.Процька. Пакутнік за веру і Бацькаўшчыну. Мн..1996.С.20).

Дарэчы, слова ***бунтаўнік*** як адэкват рас. ***бунтовщик*** падае і "Беларуска-расійскі слоўнік" М.-Байкова і С.Некрашэвіча (Мн.,1926.С.50).

(Працяг у наступным нумары).

(Працяг. Пачатак у папярэдніх нумарах.)

НЕ ПОЛЕ ПЕРАЙСЦІ

Дакументальны аповед Рыгора Шавуры

СКРЫП ТУРЭМНЫХ ВАРОТ

Праз некаторы час вечарам у кватэру Алены Іосіфаўны з'явіўся следчы НКУС Маджар, міліцыянер і кіроўца машыны. Сталі гучна стукацца ў дзверы. Тут жа пасыпаліся зняважлівыя словы, пагрозы. Сын прачнуўся, заплакаў. Выйсця іншага не заставалася, як адчыніць. Тройка ўвайшла ў кватэру. Следчы тут жа прад'явіў ордэр на арышт. Алена Іосіфаўна запытала:

—Куды мяне павязуць?

—У турму.

—А сына куды?

—У дзетдом. Сын жа не вінаваты, што яго бацька вораг народа.

Следчы патрабаваў ад Красічкавай, каб яна напісала мужу запіску, што ўсё ў парадку, што жывуць добра і г.д. Потым ён звярнуўся да хлопчыка і сказаў:

—Бацька твой – не просты салдат. Неабходны былі подпісы Яжова і Варашылава, каб яго арыштаваць.

Пасля вось такой невялікай фармальнай працэдуры ўступлення да галоўнай мэты візіту "начных гасцей", паступіла каманда збірацца у дарогу рэчы. Алена Іосіфаўна ў крайнім адчаі і разгубленасці штосьці збірала, апранала сына, нейкія рэчы клала ў чамаданы, але поўнай усвядомленасці таго, навошта яны, куды давядзецца ехаць, на колькі часу – не было. Галава нічога не разумела. Усё навокал, як у непрытомнасці. У кватэры заставаліся рэчы, не было сумнення, што вернемся ж неўзабаве дамоў.

Выйшлі ў двор. Там стаялі дзве машыны – ЭМКа і "Варанок". Паступіла каманда развітацца з сынам. Алена Іосіфаўна разгубілася. Чаму развітацца? Куды яго павязуць. Воўка абвіўся вакол шыі маці, моцна заламантаваў. Цельца яго задрыжала, закалаціліся ручкі. Сэрца Алены Іосіфаўны аблілося кроўю, перахапіла дых, пацямнела ў вачах. Няўжо гэта канец? Але за што?

Часу на пытанні, а тым больш на іх адказы ўжо не было. Двое падыйшлі да арыштаваных і пачалі разнімаць іх. Не прайшло і хвіліны, як груба і бязлітасна адарвалі ад маці і панеслі яго да легкавушкі. Алена Іосіфаўна закрычала так моцна і так адчаяна, што аж рэха разнеслася па ўсёй акрузе. "Тройка", убачыўшы такую сцэну, занепакоілася і вельмі хутка, бадай што волакам пацягнула жанчыну да "варанка". Картэдж рушыў у дарогу. З бункерападобнага, аканта-ванага жалезам "лімузіна" даносіўся глухі крык чалавека, які быццам назаўсёды развітваўся з жыццём, з усім тым, што так блізка, дорага і любіма сэрцу.

Расчыніліся цяжкія вароты турмы, машына ўехала на яе тэрыторыю. Алену Іосіфаўну высадзілі, закамандавалі браць з сабой чамаданы і павялі ў дзяжурны пакой. Крык працягваўся. Наглядальнік звярнуўся да Красічкавай і сказаў:

—Чаго крычыш? Тут турма савецкая, а не кадэцкая.

Ён падштурхнуў жанчыну ў пакой, дзе не было ні лавак, ні ложка. Так да раніцы яна білася аб халодную, бетонную падлогу, аблівалася слязамі, няведама ў каго прасіла міласці і ратунку.

Раніцай з'явіўся наглядальнік, скамандаваў ісці ў лазню. Пасля лазні павялі ў жаночы корпус. Асабістыя рэчы (амаль пусты чамадан) здалі ў камеру захоўвання і праз доўгі паўцёмны калідор прывялі да жаночай палаты. Адчынілі дзверы і ўпіхнулі Алену Іосіфаўну ў вялізны і вельмі непрыглядны пакой. Да сотні жанчын. Збітыя ў нейкія групы на падлозе, нарах адразу звярнулі ўвагу на "новенькую". Карціна ўбачанага была вельмі гнятлівай. Красічкава яшчэ больш разгубілася. Яна павалілася на падлогу і гучна заплакала. Да яе падыйшла жанчына-доктар і стала ўгаворваць, супакойваць. Глядзець на гэтую карціну было страшна. Адна з вязніц напэўна пaмяшалася галавой, крычала, бегала бадай што па целах іншых жанчын пакуль наглядальнік яе не забраў з пакоя.

Пацягнуліся доўгія, змрочныя дні допытаў. Кожнага па некалькі разоў выводзілі, дапытвалі, нешта следчыя запісвалі, але пратаколы прымушалі падпісваць зусім чыстымі лістамі. Што ў іх потым пісалася – ніхто не ведаў. Было ўсё роўна, які змест яны насілі. Пасля такіх пакут, душэўнага надлому, здзекаў усё навокал набывала бяссэнсоўны змест.

У турэмнай палаце куды была адпраўлена Алена Іосіфаўна, знаходзілася каля 100 жанчын. Усе размяшчаліся на здвоеных жалезных ложках па 4 чалавекі на кожным. Ніхто з іх не ведаў, колькі часу давядзецца знаходзіцца ў такіх брыдкіх абставінах. Не спыняліся допыты, усялякія ўдакладненні, а час ішоў. Нельга было дзень у дзень сядзець без справы і толькі чагосьці чакаць і чакаць. Рознымі шляхамі жанчыны здабывалі ніткі, іголкі, украдкай вышывалі. Раз у тыдзень прывозілі краму на тэрыторыю турмы. Там можна было купіць пэўную порцыю алею, цыбулі, аладкі. Не ва ўсіх былі грошы, таму кожны дзяліўся пакупкамі з іншымі.

Алене Іосіфаўне запамятаўся такі выпадак. Неяк ноччу следчы Маджар выклікаў яе на допыт і сказаў, што за доўгі час знаходжання ў турме ёй ніхто яшчэ не прынасіў перадачу і дастаў з кішэні 25 рублёў. Дадаў пры гэтым:

—Купіш што-небудзь сабе з прадуктаў.

Алена Іосіфаўна разгубілася, так моўчкі і выйшла ад яго. А праз некалькі тыдняў жанчыны бачылі, як і самога следчага пад канвоем вялі на допыт.

ШЛЯХ ДА "АЛЖЫРУ"

Прайшло каля года турэмнага зняволення. Нарэшце ўсё высветлілі і надышоў час абнародаваць вырак суда. У выраку значылася пяць гадоў лагернага рэжыму. Шлях ляжаў да Акмолінскага лагера жонак здраднікаў радзімы, але вязніцы не ведалі аб гэтым. Усё трымалася ў сакрэце. Жанчын пагрузілі ў таварныя вагоны, непрыстасаваныя для перавозкі людзей, добра звонку зачынілі на засаўкі і цягнік адышоў. Цвет нашай інтэлігенцыі – урачы, артысткі, музыканты, спявачкі, маці сваіх дочак і сыноў, прыгожыя, пяшчотныя, каханыя жанчыны раптам сталі злачынцамі, ворагамі самай гуманнай, як таму нас вучылі, справядлівай на свеце савецкай улады, ворагамі сваёй Радзімы. Крыўда, слёзы, зняважанні і пакуты спляліся ў адзіны чорны і брыдкі клубок , у якога толькі пачатак, а канца не бачна. Напярэдзе ўсе выпрабаванні, толькі б іх вытрымаць. Цягнік набіраў хуткасць. Ён нёс сотні, тысячы жанчын у новае, яшчэ нязведанае імі жыццё, асвечанае крывавай расой дыктатарскага рэжыму, цемрай, нецывілізаванай эпохі камуністычнай будучыні. І сярод манатонных стукаў вагонных калёс моцна і шматгалосна лілася горкая і любімая народная песня "Широка страна моя родная...". Жанчыны плакалі і спявалі, на кавалачках паперы пісалі Сталіну лісты, на прыпынках выкідвалі іх праз шчыліны вагонаў з надзеяй на тое, што яны трапяць па канкрэтнаму адрасу, што іх просьбу, мальбу, слёзы і адчай там пачуюць. Надзея цеплілася, а гэта адзіная магчымасць не памерці душэўна ды і фізічна таксама.

У Чалябінску была зроблена перасадка. Усіх выгрузілі з вагонаў, прымусілі сесці па чатыры чалавекі на снег, пералічылі і затым калонай павялі ў лазню. Жанчыны распраналіся і расходзіліся мыцца па кабінах. Усё гэта рабілася ў прысутнасці салдат аховы, якія ўсяляк зняважалі і насміхаліся над імі. А пасля мыцця неабходна было кожнай жанчыне прайсці аголенай перад грубым начальнікам, каб ён пераканаўся аб адсутнасці ў кожнай з іх залатых ці іншых каштоўных рэчаў. Гэта было ў крайняй ступені здзекам над чалавечай асобай, зняважай элементарнай чалавечай годнасці. Асуджаных калаціла ад такіх адносін з боку начальства і службы аховы. Нельга было з гэтым прымірыцца, але нікаму было скардзіцца. Пасля мыцця зноў пасадзілі па чатыры чалавека на снег, доўга пералічвалі, у чымсьці разбіраліся. Было вельмі холадна, дуў пранізлівы вецер, усе замярзалі. Нарэшце пагрузка ў вагоны, прэсная баланда і акрайчык хлеба на перакуску і зноў зацокалі жалезныя колы, цяпер ужо да самага Акмолінска.

Цягнік з асуджанымі прыбыў у Акмолінск у першыя дні снежня. Павялі на тэрыторыю лагера. Голы стэп, вецер моцны, снежны буран, мароз 40 градусаў. Птушкі мерзлі. Тэрыторыя лагера абнесена некалькімі радамі калючага дроту. Незлічоная колькасць баракаў і іншых памяшканняў. Алену Іосіфаўну з іншымі вязнямі размясцілі ў 44 барак. Кожнаму выдалі страшную па колеру, анучавую пасцельную бялізну. У два рады ад цэнтра барака – двухярусныя нары на семдзесят чалавек. Вось нарэшце атрымана "кватэра" з усімі "выгодамі" за ўсё тое, што многа ці мала добрага для краіны зроблена кожнай з іх. Насільна вырваныя з абжытых мясціны, абстаўленых і ўладкаваных асабістых кватэр, адарваныя ад дзяцей, родных і блізкіх, любімай справы і заняткаў. Дзяржава ўсё ж паклапацілася аб уладкаванні іх жыцця ў новых умовах. З гэтага дня, 3 снежня 1938 года, атрымоўваў пачатак зусім іншы лад існавання людзей, якія з лёгкай рукі кіраўнікоў нашай дзяржавы незаслужана пайшлі на катаргу, пакутавалі і памiралі. Канешне, цяпер праз больш, як 50 гадоў, не цяжка рабіць высновы і заключэнні гэтай самай горкай з'явы ў сацыяльна-грамадскім жыцці сталінскага перыяду, а тады стаяла адна мэта – выжыць, толькі выжыць людзям у тых нечалавечых умовах савецкіх канцэнтрацыйных лагераў, "раскватараваных" на поўначы Сібіры і Далёкім Усходзе. Усе мы ведаем, што мільёны нашых суграмадзян, асуджаных і сасланых загінулі з ярлыком ворага народа, хаця кожны ведаў сваю невінаватасць і марыў выжыць, а там разбяруцца.

І так, Акмолінскі лагер жонак здраднікаў Радзімы. Усімі справамі ў лагеры запраўлялі ў асноўным жанчыны – асуджаныя і вольнанаёмныя. Стражайшы рэжым, жорсткія правілы ўнутранага распарадку, цяжкая праца – усё мала-памалу неяк уваходзіла ў прывычку. З цягам часу на тэрыторыі лагера запрацавала швейна-вышывальная фабрыка. Дырэктар фабрыкі – Ануіс Марына Лазараўна (яна ж зняволеная), даведалася, што Алена Іосіфаўна знаёма з рознымі відамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, запрасіла да сябе і прапанавала стаць брыгадзірам брыгады вышывальшчыц. Апошняя пагадзілася. Стварылі шматлікую брыгаду вышывальшчыц і справа пайшла. Вышывалі абрусы, сурвэткі, падушкі, посцілкі і розныя іншыя прадметы. Работніцы былі вельмі старанныя, дысцыплінаваныя, працаздольныя. Усе выконвалі норму, а яна не была лёгкай. Кожны стараўся зарабіць неабходную пайку хлеба.

Часта з-за адсутнасці сыравіны асуджаныя перакідваліся на іншыя аб'екты працы. Самай непрыемнай, а часам і незноснай была праца па парыхтоўцы чароту. Чаротам ацяплялі памяшканні, ён ішоў і як будаўнічы матэрыял. Таму яго патрабавалася вельмі многа. На нарыхтоўку чароту трэба было ісці 6-7 кіламетраў. Цяжка было зімой. Кожны раз ішлі па цэльнаму снегу (дарог не было), стэп адкрыты, вецер, мароз да 40 градусаў, схавацца няма дзе. Заставаўся адзін ратунак – працаваць хутка, энэргічна. І калі толькі адну хвілінку прыпыніцца ад працы, адразу спіна пакрывалася скарынкай ільду. Цэлы дзень працаваць станавілася невыносным. Ды і норма планавалася вялікай – неабходна было нарэзаць, звязаць не менш як 40 увесістых снапоў (яны тут жа важыліся). Многія не вытрымлівалі.

Другой, вельмі цяжкай, сапраўды катаржнай справай было снегазатрыманне ў стэпе. Трэба было цягнуць да бясконцасці адпаведныя прылады, якія разгортвалі на бакі снег, працаваць шырачэзнай лапатай і так бадай што 10-12 гадзін у суткі.

Падымаліся ў лагеры ў 6 гадзін раніцы. Паўгадзіны на ўборку ложкаў, умыванне, потым на снеданне ў сталоўку. У сталоўцы стаялі доўгія, зробленыя з дошак сталы. Усе сядаліся, у жалезныя міскі накладвалася каша, пайка хлеба і чай, потым на работу. Па чарзе на суткі заступалі дзяжурныя. Яны наглядалі за парадкам, апальвалі памяшканні, выконвалі загады старэйшых і начальнікаў. Начальнікам лагера быў Барыпаў, яго намеснікам – Юзіпенка М.Т.

На тэрыторыі лагера знаходзілася паліклініка і бальніца. Урачамі і медсёстрамі працавалі зняволеныя, якія шмат рабілі каб падтрымаць, вылечыць хворых, аслабленых. А іх ад цяжкіх умоў працы ды і ўсяго лагернага жыцця станавілася з цягам часу больш і больш. Адной з непрыемных з'яў у лагерным жыцці былі вобшукі. Раз у месяц рабілі агляд усіх асабістых рэчаў жыльцоў барака. Выганялі ўсіх на двор і даверавалі, вольнанаёмныя жанчыны правяралі ўсё, што ў каго мелася – лісты, рэчы, адзенне і г.д. Самае страшнае адбывалася тады, калі ў каго знаходзілі кавалачак казённай тканіны, ці штонебудзь другое. Адразу дадавалі тэрмін асуджання. Усё гэта адбівалася дадатковай траўмай на псіхалагічным стане вязьняў, прыніжалася годнасць кожнага.

За зонай жаночага лагера знаходзіўся барак зняволеных злодзеяў-рэцыдывістаў і асуджаных па артыкулах асабліва цяжкіх злачынстваў. Гэты барак ахоўваўся асобна, але ежу неабходна было прыносіць з кухні жаночага лагера. Дастаўку снедання, абеду і вячэры ў загадным парадку даручылі Алене Іосіфаўне. Кожны дзень бачкі з ежай ў суправаджэнні наглядальніка лагера даводзілася насіць на іх тэрыторыю. Рабіць гэта было страшна і небяспечна. Алену Іосіфаўну наглядальнікі ўпускалі на тэрыторыю барака, а за ёй зачынялі вароты. Далей яна заставалася зусім безабароннай. Яшчэ складанасць заключалася ў тым, што ежу неабходна было раздзяляць пароўну, і каб нічога не заставалася. Інакш канфлікту не пазбегнуць, а гэта магло каштаваць жыцця. Пасля раздачы ежы, яна выходзіла з тэрыторыі барака, за ёй наглядальнікі зноў зачынялі вароты. І так працягвалася два гады. Кожны візіт туды суправаджаўся хваляваннем і страхам. Гэта было няпростым дадатковым да ўсяго іншага, лагерным выпрабаваннем.

Да 1940 года Алена Іосіфаўна ніякіх звестак ад родных і блізкіх не атрымоўвала. Яна, як і ўсе астатнія, была асуджана без права перапіскі. Два гады з лішнім у такіх незносных абставінах зняволення не мець ніякіх звестак пра сына Воўку, пра лёс мужа (яна так і не ведала, што ён 2 студзеня 1938 года ўжо быў расстраляны) і сваіх родных – гэта пакуты нечалавечыя. І вось адбылося неверагоднае. Аднойчы на вячэрняй праверцы ёй сказалі, што на яе імя прыйшоў ліст. Паверыць у гэта было немагчыма. Але калі ліст ўсё ж трымала ў руках, доўга не адкрывала яго, цалавала і плакала, плакала. Радасці не было межаў. Ліст прыслаў брат – Нагорны Іосіф Іосіфавіч. Упершыню, за некалькі год Алена Іосіфаўна даведалася пра сына, брата, сваіх родных. Яшчэ больш хацелася жыць, верыць і чакаць, лічыць дні і хвіліны хутчэйшай сустрэчы са сваімі. Пасля ліста ад брата праз некаторы час прыйшоў даўгачаканы ліст ад сына. Алена Іосіфаўна ўжо ведала, што ён знаходзіцца не ў дзетдоме, а на радзіме бацькі – Саратаўшчыне. Усё гэта неяк супакойвала яе, але сэрца рвалася да родных, хацелася хутчэй сустрэцца і забыцца пра ўсё тое, што прыйшлося зведаць і перажыць. На вялікі жаль гэтаму не было суджана збыцца. Толькі не будзем зноў апярэджваць падзеі. Наперадзе новыя цяжкасці і выпрабаванні, іх неабходна было прайсці.

(Працяг у наст. нумары.)

КОНКУРС

З блаславеньня і дзякуючы гарачай падтрымцы Яго Эмінэнцыі Кс. Кардынала Казіміра Сьвёнтэка, Каталіцкі клуб жанчын, які дзейнічае пры касьцёле сьв.Сымона і сьв. Алены ў Мінску, звяртаецца да ўсіх парафій Беларусі і сардэчна запрашае дзяцей і моладзь ва ўзросьце ад 9 да 17 гадоў да ўдзелу ў конкурсе:

"МАЦІ БОЖАЯ БУДСЛАЎСКАЯ Ў МАІМ ЖЫЦЬЦІ І ЖЫЦЬЦІ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ"

А) Выява (абраз) Маці Божай Будслаўскай
Б) Санктуарый Марыйны ў Будславе
В) Пілігрымкі да Будслава

1) Малюнкі

а) Абраз Маці Божай Будслаўскай:
(Намаляваць толькі сам абраз альбо абраз з вялікім алтаром у Санктуарыі.., усяночнае чуваньне-адарацыю люду Божага перад Цудадзейным Абразом.., альбо Цудадзейны Абраз у маім парафіяльным касьцёле.., альбо на сьцяне ў маім доме, кватэры.., над Чарнобыльскай зямлёй, над нашым краем, краявідам.., над маёй вёскай, над маім горадам..).

б) Санктуарый Марыйны Будслаўскай сьвятыні:
(Намаляваць касьцёл і кляштар, альбо працэсію апоўначы з запаленымі сьвечкамі, альбо ўрачыстае набажэнства 2 ліпеня і г.д.).

в) Маё бачаньне пілігрымкі, якая ідзе да Санктуарыя ў Будславе:
(Намаляваць, як я бачыў (бачыла) пілігрымку моладзі альбо дарослых.., сьвятароў і сясьцёр законных і іх душпастырскую працу падчас пілігрымкі; як людзі прымаюць пілігрымаў.., супольную Сьвятую Імшу на адной са стаянак пілігрымкі.., як сустракаюць пілігрымку ў Будславе і г.д.).

Праца павінна быць выканана алоўкам, акварэльлю, альбо алейнай фарбай памерам ад фармату аркуша паперы А4 і да адвольнага фармату, згодна з жаданьнем.

2) Паэзія — вершы, паэмы

а) Аб цудадзейным Абразе Маці Божай Будслаўскай.
б) Аб Санктуарыі — кляштары Будслаўскім:
(З гісторыі айцоў Бернардынаў у Будславе – апекуноў сьвятога месца).
в) Аб розных пілігрымках да Будслава і іх удзельніках – пілігрымах, як маладых, так і дарослых:
(Напісаць, як я бачыў (бачыла) пілігрымку моладзі альбо дарослых.., сьвятароў і сясьцёр законных і іх душпастырскую працу падчас пілігрымкі.., як людзі прымаюць пілігрымаў.., супольную Сьвятую Імшу на адной са стаянак пілігрымкі.., як сустракаюць пілігрымку ў Будславе.., якое ўражаньне зрабіла на цябе і іншых сама пілігрымка і Санктуарый Марыйны і г.д.).

3) Проза, — апавяданьне, эсэ, успаміны
а) Якія пачуцьці я перажываў (перажывала) падчас пілігрымкі да Цудадзейнага Абраза Маці Божай Будслаўскай:
(Напісаць, як я бачыў (бачыла) пілігрымку моладзі альбо дарослых.., сьвятароў і сясьцёр законных і іх душпастырскую працу падчас пілігрымкі.., як людзі прымаюць пілігрымаў.., супольную Сьвятую Імшу на адной са стаянак пілігрымкі.., як сустракаюць пілігрымку ў Будславе.., якое ўражаньне зрабіла на цябе і іншых сама пілігрымка і Санктуарый Марыйны і г.д.).

б) Якія ласкі атрымаў (атрымала) ты альбо тваe блізкія, знаёмыя падчас пілігрымкі і знаходжаньня ў Санктуарыі.

в) Маці Божая ў маім жыцьці, жыцьцё маёй сям'і, родных знаёмых, у жыцьці маёй Бацькаўшчыны.

Тэхніка ўсіх відаў прац адвольная, у духу каталіцка-хрысьціянскіх традыцый. Працы не падпісваць, а прысылаць пад дэвізам. Да працы дадаць заклеены канверт з поўнымі зьвесткамі аб аўтары (імя, прозвішча, узрост, адрас). На канверце зьверху напісаць дэвіз і ўзрост (колькі гадоў).

Працы на конкурс прысылаць у касьцёл сьв. Сымона і сьв.Алены не пазьней 1 верасьня 1999 г.

Конкурс прызначаны на нядзелю 19 верасьня 1999 г у 10.00.

Прадугледжаны наступныя ўзнагароды:
3 чалавекі — I месца
9 чалавек — II месца
18 чалавек — III месца
5 чалавек — заахвочвальная прэмія.

Усе ўдзельнікі – пераможцы ў якасьці ўзнагароды атрымаюць вакацыйную паездку ў ПОЛЬШЧУ альбо ГЕРМАНІЮ.

Лепшыя працы будуць завезены для выставы ў тую краіну і горад, дзе будуць адпачываць дзеці. Пасьля ўсе гэтыя працы, як мастацкія, так і літаратурныя, будуць размешчаны ў музеі Марыйнага Санктуарыя ў Будславе.

Усе астатнія ўдзельнікі Марыйнага конкурсу атрымаюць памятныя ўзнагароды, як дарунак удзячнасьці за вялікую любоў да Маці Божай і Яе Санктуарыя ў Будславе.

Сардэчна запрашаем моладзь і дзяцей Беларусі актыўна ўдзельнічаць у гэтым Марыйным конкурсе.

Працы прысылаць альбо прыносіць на адрас:
220050 Пл. Незалежнасці, 15. Ксьцёл сьв. Сымона і сьв.Алены. Менск. Тэл.220-44-15. fax. 220-55-61. (для іншагародніх код 8-017 + мінскі тэлефон альбо факс) Камісія Марыйнага конкурсу.

Менск, 13.04.1999г. Рада Каталіцкага клуба жанчын.
Узгоднена 3.05.1999г.
Ксёндз Уладыслаў Завальнюк, Пробашч.

Давайце спяваць па-беларуску

СЦЯГ

Музыка Міколы Яцкова Словы Сяргея Панізьніка



Светлым полем я нясу
Агнявую паласу:
Як маланка, нада мной
Зіхаціць над галавой
Сцяг мой вольны,
Сцяг мой смелы,
Сцяг мой бел-чырвона-белы. } 2 р.

Быў адважны продак мой
У пагоні баявой.
Той пагоні чую звон:
Хай нясецца наўздагон
Сцяг мой вольны,
Сцяг мой смелы,
Сцяг мой бел-чырвона-белы. } 2 р.

Залунай на ўвесь прасцяг
Агнявых вякоў працяг:
Ёсць Дзяржава! Ёсць Народ!
Развівайся — і ў палёт,
Сцяг мой вольны,
Сцяг мой смелы,
Сцяг мой бел-чырвона-белы. } 2 р.

Патрыярх Сусветнага Амерыканскага Беларускага Патрыярхату на Беларусі



Набажэнства з Архіепіскапам БАПНЦ на Бацькаўшчыне, Патрыярхам Сусветнага Амерыканскага Беларускага Патрыярхату Юрыем I (Рыжым), протапрасвітарам Іванам (Спасюком), і ігрэем айцом Леанідам у дамовай царкве гор. Слоніма 21 ліпеня 1999 года.



Горадня. Ля сцяны славутай Каложскай царквы XII ст

Парадак правядзення масавых мерапрыемстваў у сядзібе Таварыства беларускай мовы (г.Менск, вул. Румянцава, 13) т. 2-84-85-11

№п.п.	Дзень	Назва мер-ства	Адказ. асоба	Час правядзення
1.	Панядзелак	Паседжанне Народнага універсітэта	Анцулевіч	З 18.00да 20.00
2.	Аўторак	Паседжанне Менскай гарадской Рады ТБМ	Саламонаў	З 17.00 да 19.00
3.	Серада	Паседжанне Народнага універсітэта	Анцулевіч	З 18.00 да 20.00
4.	Чацвер	Пасяджэнне Сакратарыята ТБМ	Трусаў	З 17.00 да 19.00
5.	Субота	Дэманстрацыя замежных і айчынных відэа-стужак на беларускай мове (уваход вольны)	Станішэўскі	Пачатак у 18.00
6.	Нядзеля	Пасяджэнне суполкі "Рэфармацыя"	Фралоў	З 10.00 да 13.00
7.		Праца кніжнага клуба	Цехановіч	З 15.30 да 17.30

Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік: ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі: № 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі: 220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў: 231300, г. Ліда-2, п/с 7.
E-mail: ns@lida1.lingvo.grodno.by

Рэдакцыйная калегія:
Людміла Дзіцэвіч, Алесь Гурыновіч, Леакадзія Мілаш, Язэп Палубятка, Алесь Петрашкевіч, Лілея Сазанавец, Уладзімір Содаль, Станіслаў Суднік, Павел Сцяцко, Алег Трусаў.

Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні.
231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Газета падпісана да друку 2. 08. 99 г.
Наклад 3500 асобнікаў. Замова № 2229.
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 40 000 руб., 3 мес.- 120 000 руб.
Кошт у розніцу: 10 000 руб.